# Нацыянальна-вызваленчы рух Заходняй Беларусі
# 1921-1939 гг.
# на старонках перыядычных выданняў

(выстава на аснове архіўных дакументаў

Занальнага дзяржархіва ў

г. Маладзечна )



# Заходняя Беларусь і яе гістарычны кантэкст

У пачатку XX стагоддзя Заходняя Беларусь стала арэнай бурных падзей, звязаных з нацыянальна-вызваленчым рухам. Пасля Першай сусветнай вайны і распаду імперый, беларусы пачалі актыўна імкнуцца да стварэння незалежнай дзяржавы. У гэтым кантэксце мясцовыя газеты адыгрывалі важную ролю ў фармаванні грамадскай думкі і распаўсюджванні ідэй нацыянальнай самасвядомасці.



# Роля газет у руху

Паводле Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. да Польшчы адышлі Гродзенская, усходнія раёны Віленскай і заходнія раёны Мінскай губерняў. Гэтыя тэрыторыі атрымалі неафіцыйную назву «Заходняя Беларусь». У афіцыйных польскіх дакументах яны называліся «крэсы ўсходнія», што азначала ўсходнія ўскраіны Рэчы Паспалітай. На гэтай тэрыторыі ў 1931 г. пражывала 4,6 млн чалавек, большасць якіх складалі беларусы.

Сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Заходняй Беларусі значна адрознівалася ад астатняй Польшчы. З эканамічнага пункту гледжання, край заставаўся адсталай аграрнай ускраінай і выкарыстоўваўся пераважна як крыніца сыравіны і таннай працоўнай сілы. Такая эканамічная палітыка кіруючых колаў краіны ва ўмовах аграрнага перанасялення і масавага беспрацоўя асуджала на адсталасць і беднасць. На тэрыторыі Заходняй Беларусі разгарнуўся масавы рух супраць прыгнёту Польшчы.

Газеты таго часу сталі цэнтрамі нацыянальнай думкі. Яны публікавалі артыкулы, прысвечаныя гісторыі Беларусі, культурным традыцыям і моўным пытанням. Важным аспектам іх працы было асвятленне барацьбы за правы беларусаў ва ўмовах акупацыі.



ЗГА г. Молодечно Ф.93Оп.1Д.8.Л. 515

# БЮЛЕТЭНЬ

Соймавага Клюбу „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада

№ 13 | Вільня, Пятніца 2 ліпня 1926 году. | № 13

Які-ж сэнс усяго таго, што сталася? Шырокія масы грамадзянства чакалі вялікіх перамен і таму-то вуліцай сяляне і работнікі — пераважна ў каранной Польшчы — йшлі і часто цяпер ідуць за імём Пілсудскага, — бо спадзяваліся, што Пілсудскі, — гэты экс-сацыяліст і экс-рэвалюцыянер — які ў часе перавароту сказаў, што ня можа быць занадта многа несправядлівасьці ў адносінах да тых, якія сваю працу аддаюць іншым; — спадзяваліся, што гэты Пілсудскі дасьць сялянам зямлю, работнікам працу і вольнасьць паняволеным і прыгнечаным народам.

Але хутка настала расчараваньне. Калі гаварыць аб „крэсах“, спэцыяльна аб беларускіх землях, то можна сказаць, што там з імем Пілсудскага ня зьвязвалі вельмі вялікіх надзей. Калі хто зьвязваў гэтыя надзеі і гаварыў, што можа быць ляпей, дзякуючы гэтай перамене, то толькі таму, што за часоў, калі Пілсудскі быў Начальнікам Дзяржавы, селянін гэтакіх падаткаў не плаціў, якія плаціў за часоў Грабскага і Скшынскага. (Перарываньні). Плаціў інфляцыю, але на гэта трэба быць эканамістам, каб зразумець, што гэта такое інфляцыя. Селянін гэтага не разумее і думаў, што гэта дзякуючы вайне. Але зараз пасьля перавароту Пілсудскага прыйшлі срокі платы падаткаў, розных прасрочаньняў, і калі **пры сьцягваньні гэтых падаткаў пачалі сьцягаць скуру з селяніна**, селянін сказаў: „Даволі“.

І прыпомніў сабе Пілсудскага, таго Пілсудскага, які распачаў асадніцтва на „Крэсах“, таго Пілсудскага, пры якім [illegible] гэтак, як цяпер, таго Пілсудскага, які абяцаў фэдэрацыю, і які пасьля вельмі ўстыдліва яе выракся і сказаў, што хоць гаворыў аб фэдэрацыі, але ніколі паважна гэта не трактаваў. **Сказў тады селянін: „Даволі“; ня можна спадзявацца ад Пілсудскага палёгкі“.**

ЗГА г. Молодечно Ф.93Оп.1Д.8.Л.507

У першай палове 1920-х гг. адбывалася паступовае павелічэнне кольскасці беларускамоўнай перыёдыкі. Напрыклад, толькі ў Польшчы, у 1926 - 1927 гг. выходзіла больш за 30 газет і часопісаў. Адной з іх быў «Бюлетэнь» клубу Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады.

БСРГ у вельмі неспрыяльных умовах і за кароткі час здолела заваяваць шырокую папулярнасць і падтрымку сярод заходнебеларускага сялянства. Паводле дадзеных даследчыкаў, на студзень 1927 г. у склад БСРГ уваходіла каля 100 000 членаў і каля 400 000 спачуваючых. Па аграрным пытанні БСРГ стаяла на абароне жыццевых інтарэсаў заходнебеларускага сялянства, за надзяленне яго на льготных умовах зямлёй і стварэнне эканамічна моцных сялянскіх гаспадарак. Для большасці заходнебеларускага сялянства БСРГ была надзеяй на лепшую будучыню, паслядоўным абаронцам іх эканамічных інтарэсаў і грамадзянскіх правоў.

Таварышы рабочыя і сяляне. Пішэце карэспандэнцыі ў сваю газэту „Червоны Сьцяг“. Пішэце аб сваіх крыўдах, пра сваю барацьбу. Няхай ваша крыўда запаліць іншых працоўных да барацьбы, а ваша барацьба навуча як трэба змагацца за свае штодзённыя патрэбы, за сваё вызваленьне.

Таварышы, рабочыя і сяляне! Зьбірайце грошы на свае газэты „Чырвоны Сьцяг“ і „Бальшавік“.

Толькі пры шырокім падтрыманьні ўсіх працоўных можа існаваць і разьвівацца ваша прэса.

Карэспандэнцыі і грошы перадавайце мясцовым арганізацыям КПЗБ, а яны перашлюць Цэнтральнаму Камітэту Компартыі.

ЗГА г. Молодечно Ф.93Оп.1Д.8.Л.296

Беларускі перыядычны друк пакутваў на слабое фінансаванне, абмежаваную чытацкую базу і частыя канфіскацыі. Часта, каб працягваць публіцыстычную дзейнасць, прыходзілася мяняць назву перыядычнага выдання.



Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ СПРАВА

Выходзіць два разы ў тыдзень

Вільня, Нядзеля, 11-га ліпня 1926 г.

Год І.

ЗГА г. Молодечно Ф.93Оп.1Д.8.Л.510



Да здравствует борьба селян за освобождение труда от эксплоатации.

# ПАХАРЬ

Да здравствует селянско-рабочее правительство.

## Орган Независимой Селянской Партии.

Под главным руководством депутата БОНА.

| | | |
|---|---|---|
| Выходит два раза в месяц<br>Подписная цена<br>за три месяца . . 1 зл.<br>за год : : : : . 3 „ | Адрес Редакции и Администрации:<br>Варшава, Старе Място 38 кв. 4. (Warszawa Stare Miasto 38 m. 4). Деньги высылать P. K. O. № 8808. | Цена об'явлении по особому соглашении с Администрацией. |

№ 1. Среда 1 Сентября 1926 г. Год I.

### Од Редакции:

Независимая Селянская Партия хотела бы издавать газету на родном языке каждаго народа.

Не имея, однако, в настоящее время возможности издавать газету на родных языках: украинском, белорусском, чешском и других, пишем по-русски, ибо большинству селян язык этот понятен.

ПО РАСПОРЯЖЕНИЮ ПРАВИТЕЛЬСТВЕННАГО КОММИСАРА ГОР. ВАРШАВЫ ГЕНЕРАЛА СКЛАДКОВСКАГО ПЕРВЫЙ НОМЕР „БОРЬБЫ“ КОНФИСКОВАН ЗА ЦЕЛЫЙ РЯД СТАТЕЙ...

По распоряжению правительственнаго комисаря гор. Варшавы генерала Складковскаго второй номер „Борьбы“ конфискован за статьи: „Тернистый путь“, „Конституция“ и „Жители сел и деревень“.

ГАЗЕТА „БОРЬБА“ ПОСТАНОВЛЕНИЕМ СУДА ЗАКРЫТА.

### В наши дни.

Наступили трудные дни для Независимой Селянской Партии. Газета „Борьба“ не может заглянуть в хаты селян. Все конфискуют, да конфискуют, а сейчас уже и совсем закрыли.

Казалось, так осторожно писали, так легонько и спокойно, что трудно было найти в нашей газете что-либо такое, что уж очень больно задевало бы „ясных панов“. А все-таки номер первый, а за ним и второй конфискован. Третьему номеру не дали выйти, закрыв газету.

Причем обвинили „Борьбу“, например, за те статьи, которые перепечатаны из „незалежнаго хлопа.“ Даже воззвание пинскаго окружнаго комитета, которое за несколько недель до того вышло легально, теперь в „Борьбе“ конфисковано.

„Борьба“ раздавлена.

Но значит ли это, что голос Независимой Селянской Партии перестанет долетать до сел и деревень, что идеалы партии не станут больше проникать в душу селянскаго люда?

Конечно нет!

„Борьба“ закрыта. Но выходит уже первый номер „Пахаря“, тоже газеты Независимой Селянской Партии.



2 ПАХАРЬ № 1

„Пахарь“ будет говорить:

о всех тяжестях, переживаемых трудовым селянским классом;

о необходимости наделения селян землею;

о перестройстве быта так, чтобы трудовой народ мог жить безбедно;

о путях, ведущих к лучшим дням.

Писать же в газету должны сами селяне, дабы этой дорогой установить связь между собою.

Суждено ли явиться „Пахарю“?

Пока больше не пишем, ибо конфискуют невиннаго „Пахаря“ и даже нескольких строк не удастся прочесть селянам.

А газету будем издавать. Если же после долгих усилий газету все-таки уничтожат, то придется искать других дорог. Тогда многие селяне, многие члены партии, зная программу Н.С.П., идя от села к селу, будут гласить на родном языке правду, исходящую, как луч солнца, от идеи, возлелеянной Независимой Селянской Партией.

РЕДАКЦИОННЫЙ КОМИТЕТ.

ЗГА г. Молодечно Ф.93Оп.1Д.8.Л.634

Цана асобнага нумару 20 грош.

# НАРОДНАЯ СПРАВА

508

Выходзіць два разы ў тыдзень.

| | | |
|---|---|---|
| Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3. | Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл.50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр. Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі. | Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту. |

№ 2 Вільня, Пятніца, 2-га ліпня 1926 г. Год I.

## Ад слоў да дзела.

Многа пекных слоў нагаварыла нам у сваіх нашумеўшых „дэклярацыях“ тая польская нацыяналістычная „лявіца“, якая і фізычна і маральна падтрымала „пераварот“ марш. Пілсудскага, запэўняючы нашы працоўныя масы, што ад гэнага „перавароту“ настане і для нас „рай“ у Польшчы. — Але не дарма беларускія сяляне і работнікі аднясьліся да гэных пекных слоў дужа недаверчыва: з першых жа крокаў новага ўраду ясна відаць, чаго ад яго можа спадзявацца працоўная Беларусь.

Перадусім трэба адзначыць тыя крокі ўраду „маральнае санацыі“, якія датыкаюць сацыяльнае пытаньне, — у першую чаргу *зямельную справу*. Бо-ж справа беларуская ў Польшчы—гэта ня толькі справа нацыянальная, а і сацыяльная: ня можа быць месца для шырокага культурна-нацыянальнага руху там, дзе народ галодны, прыгнечаны эканамічна, вядзе жыцьцё нейкіх паднявольных рабоў....

Ніжэй мы даем стацьцю аб пастанове гаспадарчага камітэту рады міністраў у справе *валёрызацыі банкаўскіх пазык сялянству на куплю зямлі з парцэляцыі*. Хаця ў нас вельмі мала такіх „шчасьліўцаў“, якія дасталі ўрадовы пазыку, чаго можам спадзявацца ў справе забясьпечаньня нашага сялянства зямлёй. А вось дапаўненьне да гэнае пастановы.

На паседжаньні бюджэтнае камісіі — пры разглядзе асыгновак на міністэрства зямельных рэформ —украінскі пасол Васыньчук зьвярнуўся да пана прэм‘ера з запытаньнем: ці запраўды тыя грошы, якія пастаўлены ў бюджэце на выдаткі гэнага міністэрства ў наступным квартале, празначаны *на асадніцтва*? На гэта галава ўраду п. Бартэль адказу ня даў... I ўжо на пленуме Сойму той-жа пасол Васыньчук сцьвярдзіў, як *незапярэчаны факт*, што ўрад дае на асаднікаў вялізарную суму грошы, абмяжовываючы гэтым блізу ўсю сваю дзеяльнасьць па правядзенью ў жыцьцё зямельнае рэформы.

А ... цяжар паляг-

А можа хоць падаткавы цяжар паляг
чэе?!—I на гэта адказ ужо дадзены ўрадам
п. п. Бартля-Пілсудскага. *Падаткі ўсе па*
*дыймаюцца на 10%*, — знача, на дзесятук
частку дасюляшніх. На рахунак гэнае пад
баўкі п. Пілсудскі ўжо загадаў выплаціць пэн
сіі вайсковым за ліпень у павялічаным разь
меры....

...А ... што *для школ* будзе зроблена? Мо
...чыняюць урэшце хоць тыя школы, н
...ія пададзены ўжо летась дэклярацыі?! А
...этым нічога ня чутно. Ня чутно і аб пад
...уцы вучыцялёў для гэных школ—аб ства
...эньні вучыцельскіх сэмінарыяў, курсаў і т. п
...якія далі-б магчымасьць хоць праз год пры
ступіць да спаўненьня таго, на што навет эн
дэкі згаджаліся, праводзячы „языковыя“ за
коны,—праўда, нікім не прызнаваныя.... Ка
жуць, што ўрад маніцца ўзяць назад тольк
адзін цыркуляр былага эндэцкага міністр
асьветы Грабскага: аб навуцы ў гімназіях з ня
польскай выкладовай мовай гісторыі і геагра
фіі—папольску. Ну, дык-жа ніводная гімна
зія—ані беларуская, ані жыдоўская, ані ўкра
інская ці літоўская—не паслухалася яго і ўс
роўна слухацца ня будзе! -- А вось і сёлет
беларускім матурыстам дзьверы ў польскі
ўнівэрсытэты зачынены, і яны прымушан
тайна (бо пашпартоў не даюць!) уцякаць за
граніцу, каб вучыцца тамака далей.....

ЗГА г. Молодечно
Ф.93Оп.1Д.8.Л.508

# „Сацыяльная палітыка" новага Ураду на „Крэсах".

*(Як урад пачаў „фінансаваць" набываньне зямлі мясцовым малазямельным сялянствам, а як—асадніцтва).*

Запраўднае абліччa, ці сацыяльная прырода ўраду „маральнай рэвалюцыі" выяўляецца ўсё ясьней — па меры таго, як паны палажэньня ад пекных слоў пераходзяць да дзела...

З гэтага пункту гледжаньня, можа, найбольш характэрным крокам новага, створанага польскай дэмакратыяй ураду зьяўляецца пастанова „Гаспадарчага Камітэту" Рады Міністраў, прынятая 14 чэрвеня: яна раскрывае да канца яго варожую для сялянскай беднаты наагул, а асабліва для беларускага ды ўкраінскага сялянства на „Крэсах", —чыста „асадніцкую" прыроду.

Гэта пастанова кажа, што тыя доўгатэрміновыя пазыкі, якія набыўцы парцэляванай зямлі — на падставе „Закону аб парцэляцыі і асадніцтве"—атрымалі ці маюць атрымаць з дзяржаўных банкаў, павінны быць пералічаны з злотых—на золата, дый, ведама-ж, сплаты па гэтым пазыкам таксама павінны рабіцца—„у стасунку да вартасьці золата"... Гэта — агульнае правіла („засада"); аб вынятку з яго — глядзі далей...

Газэты не паведамляюць, ці ўсе пазычаныя дагэтуль сумы маюць быць валёрызаваны *) паводле цяперашняга курсу злотага, ці — паводле курсу таго дня, калі выдана пазыка.

Наскольki гэтае „правіла", дэкрэтаванае Радай Міністраў, важна для малазямельніка, купляючага зямлю — з пазыкай у дзяржаўным банку, стане ясным з практычнага прыкладу. —

Калі хлебароб пазычыў у дзяржаўным банку, прыкладам, 1000 злотых сёньня, калі курс даляра —10 злотых (курс золата заўсёды крыху вышэй), а праз нейкі час курс даляра, барані Бог, падскочыць, прыкладам, удвая, стаўшы ізноў на даўжэйшы час цьвёрда на 20 злотых, тады пазычаная селянінам сума таксама будзе лічыцца дзяржаўным банкам удвая, ці, замест 1000 зл., вырасьце — ў 2000 злотых. Дык, зразумела, і працэнты банк будзе спаганяць з даўжніка ўжо з „валерызаванай" сумы 2000 зл... I гэта — зусім незалежна ад таго, ці таксама, як пры пераводзе на золата і даляры, зьменшылася набыўчая (пакупная) сіла — польскага злотага ў краі.

Каб гэта стала зусім ясна, возьмем параўнаньне з мінулым годам.

Кожны ведае, што „залатая вартасьць" злотага, ці яго курс адносна да даляра цяпер — роўна удвая [illegible] як год назад [illegible] злотага ў краі асталася больш-менш тая-ж, якая была ў прошлым годзе. Гэта значыць, што цэны ў злотым асталіся ў краі тыя-ж, але пры пераводзе на золата яны ўпалі ўдвая.

Калі-б выданае Камітэтам „правіла" дзеяла назад, тады селянін, які пазычыў год таму 1000 злотых, будзе мець раптам на карку доўгу — аж 2000 злотых,—хаця зусім ня было адпаведнага спадку пакупной сілы злотага ў краі, і селянін мусіць па старым цэнам за злотыя прадаваць свае прадукты, якія ён мае з купленай зямлі (—хлеб і інш.)...

Тое-ж самае пагражае ўсім сялянам-кліентам дзяржаўных банкаў і тады, калі толькі ад сёньня (а не назад) будуць звалерызаваны па залатому курсу дня ўсе іх пазыкі, і калі ў далейшым „залатая вартасьць злотага" (яго заграничны курс) будзе спадаць, не выклікаючы адначасна такога-ж спадку ўнутранай вартасьці злотага, ці—адпаведнага ўзросту цэн у краі... Тады селянін-даўжнік польскай дзяржавы, навет плоцячы ёй акуратна падвойныя ці патройныя процанты, ня толькі ня будзе з часам сплачываць свой доўг, але наадварот—усё глыбей залязаць з галавой у кабалу, бо доўг будзе ўсё расьці...

Ведама ж,—такой „крэдытнай дапамогі" з боку дзяржавы ня вытрымае ня толькі маладая слабасільная гаспадарка малазямельніка, але—навет моцная—абшарніцкая, дый ня толькі ў нашы крытычныя часы!!.

ЗГА г. Молодечно
Ф.93Оп.1Д.8.Л.508

„Беларуская Справа", адзіная ў Заходняй Беларусі беларуская газэта, якая стаіць у абароне інтарэсаў працоўнага сялянства і рабочых.

Кожны сьвядомы беларус павінен чытаць, распаўсюджываць, выпісываць і дапамагаць сваей газэце.

ЗГА г. Молодечно
Ф.93Оп.1Д.8.Л.510

Складаным было становішча ў культурна-этнічнай сферы жыцця беларусаў. Замест культурнага ўзаемадзеяння ў норму ўвайшоў уціск і гвалт супраць беларускай культуры і мовы.



## Да усіх сялян беларусау і грамадзян, спрыяючых асьвеце.

Глыбоцкая Акружная Управа Таварыства Беларускай Школы паставіла сваей найбліжэйшай задачай адчыніць Беларускую Гімназію ў Глыбокім.

Усім ведама, як цяжка мужыку пасылаць свайго сына, ці дачку ў горад і пракарміць яго там. Усім таксама ведама, што ў сучаснай польскай школе беларускія дзеткі маюць ня толькі труднасьці з мовой, але навучаюцца там толькі шанаваць усё „панскае“, ды пагарджаць вяско-[illegible] і мястовых работнікаў. Нам патрэбна свая незалежная школа!

Галоўная бяда Глыбокага—гэта нястача будынку пад школу, які пабудаваць уласнымі сіламі мясцовае сялянства ня можа. Дзеля таго Управа Таварыства Бел. Школы зьвяртаецца да ўсіх беларусаў, знаходячыхся ці то ў Польшчы, ці ў Радавай Рэспубліцы, Латвіі, Ліцьве, ці ў Амэрыцы—з просьбай адгукнуцца на наш заклік і памагчы сваей ахвярай адбудаваць памешканьне для Гімназіі, палажыць свае цэгліны пад гэты будынак.

Управа з шчырай падзякай прыймае ўсякі дар і будзе ў газэце вясьці іх рахунак.

Ахвяры прыймаюцца скарбнікам Управы Верай Дрозд (Глыбокае, вул. Сенкевіча № 17) і Беларускім Банкам у Вільні (Віленская 8).

Старшыня Управы: Мятла.
Сябры: Дрозд, Зіваліч.
Сэкрэтар: В. Скурко.

Увага: Ахвяраваўшыя вартасьць 1 доляра будуць лічыцца пачэснымі сябрамі таварыства; ах-

Адказны-Рэдактар: Т. Крачына.



## Бацькі—беларусы!

Закончыўся ўжо школьны год, і сярэднія школы ўжо рыхтуюцца к новаму году, прымаюць вучняў на гэты новы год.

Вялікую вагу мае для нашай вёскі тое, куды — у якую школу павядзе ў гэты час свайго сына, ці дачку той бацька беларус, які хоча даць сваім дзецям навуку.

Да гэтага часу напаўняў ён сваімі дзяцьмі экзаменацыйныя салі польскіх школ, якія дакляруюць яго дзецям розныя прывелеі і правы. Але сучасная польская школа толькі ламаець беларускіх дзяцей, стараецца зрабіць з дзяцей будучых „паноў“, ворагаў сваіх бацькоў—сялян.

Памятайце, сяляне, аб тым, што правамі сучасная польская школа хоча купіць вашых дзяцей. Паглядзіце на вашых суседзяў, дзеці каторых вучыліся ў „państwowych gimnazjach“, і вы пабачыце, што ад гэтых школ карысьці нам няма!..

У нас ня многа беларускіх сярэдніх школ (у Вільні, Радашковічах, Клецку і Наваградку); школы гэтыя таксама маюць яшчэ шмат хібаў, але школы гэтыя—нашыя! Сяляне самі іх закладаюць, сяляне могуць зрабіць іх гэтакімі, як для працоўнага народу патраба.

Мала іх—тварыце новыя.

Нам кажуць—і праўду кажуць, што сярэдняя беларуская школа — бяспраўная, што па скончэньні яе нельга паступіць у вышэйшую польскую школу, ні на ўрадовую пасаду.

Дабіцца правоў мы можам толькі барацьбой за школы. Будуць школы, будуць і правы для іх, будуць студэнты-беларусы—будзе для іх і Унівэрсытэт.

Пасылайце сваіх дзяцей у беларускія школы!

ЗГА г. Молодечно Ф.93Оп.1Д.8.Л.509

Польскія ўрады ў першай палове 1920-х гадоў праводзілі палітыку нацыянальнай асіміляцыі. Найперш гэта праявілася ў паскоранай і гвалтоўнай паланізацыі, што ажыццяўлялася польскай школай, каталіцкай 17 царквой, друкам, паліцэйска-адміністрацыйным апаратам, праз каланізацыю, агітацыйна-прапагандысцкую работу і г. д.




ЗГА г. Молодечно Ф.93Оп.1Д.8.Л.515

Розныя партыі і рухі выпускалі свае перыядычныя выданні (легальныя і нелегальныя), а таксама звароты, пракламацыі, і інш. Перыядычныя выданні падзяляліся на літаратурна-грамадскія, канфесійныя, сатырычныя і інш.; прызначаліся для сялян, рабочых, вучняў, студэнтаў, салдат, жанчын; выходзілі на беларускай, рускай, польскай, літоўскай, яўрэйскай мовах. За 1921—1939 гоады заходнебеларускі друк налічваў каля 270 перыядычных выданняў, у т.л. каля 70 газет-аднадзёнак.

Часопісы і газеты яскрава выступалі у абарону інтарэсаў народа Заходняй Беларусі, садзейнічалі фарміраванню яго нацыянальнай і палітычнай свядомасці, асуджалі палітыку сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту польскіх улад. Працавалі ў розных жанрах: публікавалі мастацкія творы (вершы, байкі, апавяданні, фельетоны, эпіграмы, гумарэскі, жарты), публіцыстычныя артыкулы, допісы.



# Загранічны гумар.

Бедны, бедны „дух Лёкарно“
Уцякае ва ўсе ногі,
Бо у мамы у Эўропы
Многа жаху і трывогі.

Чорны хмары над Эўропай,
Дзе ні глянеш, дзе ні пойдзеш.
Дзе-ж „анёлку“ супачынеш?
Дзе спакой нарэшце знойдзеш?!

(Нямецкая карыкат.)

Вось як выглядае новая эўропэйская роўнавага, або „Саюз бясьпечнасьці“, над якім уся Эўропа і Ліга Народаў ламае сабе галаву.

(Амстэрдам — Голяндыя).

Крычыць Францыя на сьвет цэлы:
— Гвалт! Ратуйце! У дзень белы
Немец зброіцца пацiху, —
Быць відаць якомусь ліху!

А сама зброі болей пуда
Начапляла і, як Юда,
Яна „анёлка“ ўжо цалуе...
І у друзаў бомбы дуе!

(Нямецкая карыкат.)

ЗГА г. Молодечно Ф.93Оп.1Д.8.Л.513

Часопісы публікавалі творы Язэпа Драздовіча (Народніка), сатырычныя вершы Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кандрата Крапівы і іншых. Карыкатуры і гумарыстычныя малюнкі Язэпа Горыда, Язэпа Драздовіча, Івана Маразовіча, Васіля Сідаровіча, Мікалая Васілеўскага  вылучаліся прафесіяналізмам, вастрынёй і надзённасцю, палітычным падтэкстам.



„Рэнумэрацыя“.

Дырэктар дзяржаўнага сьпіртавога манаполю Падкаморскі адтрымаў апрача пэнсіі яшчэ і *„рэнумэрацыю“* (нагараду) лікам 28.899 злотых, а дырэктар дзярж. табачнага монополю адтрымаў 23.785 зл., а памочнікі іх таксама адтрымлівалі гэткія-ж *„рэнумэрацыі“* ў суме ад 15.796 да 7–8,000 злот.

(З газэт).

Голь-бяда гуляе ў краі,
Пролетары ледзьве дыша,
Дырэктораў чорна зграя
„Рэнумэраткі“ сабе піша.

Да людзкой бяды-нядолі
Сэрца іх, як камень, глуха;
Ім ніколі не даволі, —
Ненасытна іхна бруха!

*Ошчэндзаюць, рэдукуюць,*
Каб напхаць як мех скарбовы
І падаткі ўсьцяж шыкуюць
Нават з сьвінкі і з каровы.

Мрэць бяз працы безработны,
Высах ён: скура ды косьці, —
Цяжкі лёс яго гаротны,
Бо у краі *ошчэндносьці*!

Не даюць нам роднай школы:
— *Нéма сьродкув, „ошчэндносьці“*, —
Наш вучыцель босы, голы
Вые з голаду і злосьці.

Толькі панам дырэкторам
Ня прыходзіць ў голаў штосьці,
Што ганебны грэх і сорам
Браць людзкія *ошчэндносьці*.

**Янка Маланка.**

ЗГА г. Молодечно Ф.93Оп.1Д.8.Л.515



**ПАВІНШАВАНЬНЕ.**

Рэдакцыя „Маланкі“ на гэтым месцы складвае нашаму супрацоўніку і маладому мастаку Ю. Ш...... свае сардэчнае павіншаваньне з прычыны шчасьлівага злажэньня ім матуральных экзамэнаў пры Віленскай Беларускай Гімназіі.

Мы верым, што распачатая Вамі праца для дабра нашай дарагой Беларусі, будзе заўсёды сьвяціць Вам, як пуцяводная зорка, і дасьць Вам сілу і радасьць жыцьцёвую у штодзенным і цяжкім змаганьні.

Друкарня Б. Клецкіна, Вільня

ЗГА г. Молодечно Ф.93Оп.1Д.8.Л.512

Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў пачатку ХХ стагоддзя быў складаным і шматгранным працэсам. Газеты адыгрывалі ключавую ролю ў яго развіцці, становячыся трыбунай для выражэння нацыянальных памкненняў і барацьбы за свабоду. Яны натхняюць сучасныя пакаленні на захаванне культурнай ідэнтычнасці і гістарычнай памяці.

Нягледзячы на складаныя ўмовы выхаду і абмеважанасць магчымасцяў, беларускамоўныя выданні часоў Заходняй Беларусі мелі дакладна акрэслены ўплыў на грамадства. Сама іх наяўнасць дапамагала падтрымліваць адзінства беларускага народа, ўмацоўваць нацыянальную свядомасць. Гэтыя выданні з’яўляліся пляцоўкай для грамадска-палітычных дыскусій: з аднаго боку, яны служылі адным з інструментаў палітычнай прапаганды, але ў той жа час прадстаўлялі магчымасць пераадолення ідэйных разыходжанняў дзеля адзінай задачы - захавання і развіцця беларускай нацыі.

Дзякуючы вызваленчагму паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь у 1939 г., падзеленыую па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора, беларускі народ уз'яднаўся. Адноўленае тады адзінства дазволіла Беларусі выстаяць у гады Вялікай Айчыннай вайны, заняць ганаровае месца ў міжнароднай супольнасці, стаць адным з сузаснавальнікаў ААН. Дзень народнага адзінства – 17 верасня- служыць яшчэ адным напамінам аб непахіснасці і самадастатковасці беларускай нацыі і дзяржаўнасці, фарміруе пачуццё датычнасці да краіны і лёсу кожнага грамадзяніна.



Чырвонаармейцы раздаюць газету "праўда" жыхарам далучаных да СССР тэрыторый у Заходняй Беларусі. Здымак зроблены ў горадзе Маладзечна (на момант здымкі - павет у складзе Віленскага ваяводства. Сучасная тэрыторыя Мінскай вобласці Беларусі). Крыніца: sputnik.by. Крыніца інфармацыі пра фота: photo.rgakfd.ru (Федэральная казённая ўстанова "Расійскі дзяржаўны архіў кінафотадакументаў"»

Занальны дзяржархіў у г. Маладзечна